**НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ**
**ЦЭНТР ДАСЛЕДАВАННЯЎ БЕЛАРУСКАЙ**
**КУЛЬТУРЫ, МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ**
**ІНСТЫТУТ МОВАЗНАЎСТВА ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА**

І Н Ф А Р М А Ц Ы Й Н Ы   Л І С Т

Паважаныя калегі!

Запрашаем вас прыняць удзел у
Міжнароднай навуковай канферэнцыі
**«ДЫНАМІКА НОРМАЎ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ»,**
якая адбудзецца
*19–20 лістапада 2026 года (г. Мінск, Рэспубліка Беларусь)*

**Праблемнае поле канферэнцыі:**

- Дынаміка развіцця і сучасны стан беларускай літаратурнай мовы.
- Літаратурная норма і узус, праблемы нармалізацыі і кадыфікацыі мовы.
- Гісторыя фарміравання і замацавання арфаграфічных нормаў: ад Акадэмічнай канферэнцыі 1926 года да сучаснасці.
- Беларуска-славянскае і беларуска-неславянскае моўнае ўзаемадзеянне на розных гістарычных этапах.
- Лінгвакультуралагічныя праблемы функцыянавання сучаснай беларускай мовы ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму.
- Актуальныя магчымасці і адметнасці даследавання сучасных беларускіх дыялектаў.
- Міжкультурныя камунікацыі і сучасныя камп’ютарныя тэхналогіі.
- Сучасныя тэндэнцыі даследавання мовы пісьменнікаў.
- Фарміраванне моўных і маўленчых навыкаў у школьнікаў на ўроках беларускай мовы.

Канферэнцыя пройдзе ў Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа (г. Мінск, вул. Сурганава, д. 1, к. 2), магчымы дыстанцыйны ўдзел.

Рэгламент: даклады на пленарным пасяджэнні – да 20 хвілін, на секцыйных пасяджэннях – да 15 хвілін. Выступленні і паведамленні падчас дыскусій – да 5 хвілін.

Рабочыя мовы канферэнцыі: беларуская, руская.

Па выніках работы форума плануецца выданне зборніка навуковых артыкулаў. Публікацыя матэрыялаў бясплатная. Тэкст артыкула павінен быць афармлены ў адпаведнасці з патрабаваннямі, прыведзенымі ў Дадатку 2.

Заяўкі для ўдзелу (гл. Дадатак 1) і артыкулы для публікацыі просім дасылаць на адрас nanbvprusak@yandex.ru да **25 кастрычніка 2026 г.**

Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору матэрыялаў для публікацыі.

Праезд, пражыванне і харчаванне ажыццяўляюцца за кошт удзельнікаў канферэнцыі або арганізацый, якія іх накіроўваюць.

Інфармацыю аб правядзенні канферэнцыі можна атрымаць на сайце Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа (https://iml.basnet.by).

Адрас Аргкамітэта: 220072, г. Мінск, вул. Сурганава, д. 1, к. 2.

Каардынатары канферэнцыі:

Капылоў Ігар Лявонавіч, дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа, тэл. +375 17 270 13 31;

Русак Валянціна Паўлаўна, загадчык аддзела сучаснай беларускай мовы, тэл. +375 29 120 97 40;

Мандзік Вераніка Аляксандраўна, старшы навуковы супрацоўнік аддзела сучаснай беларускай мовы, тэл. +375 44 799 33 83.

*АРГКАМІТЭТ*

Дадатак 1

Заяўка
для ўдзелу ў Міжнароднай навуковай канферэнцыі
**«ДЫНАМІКА НОРМАЎ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ»**
*19–20 лістапада 2026 года, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

| | |
|---|---|
| Прозвішча, імя, імя па бацьку | |
| Месца працы | |
| Пасада | |
| Вучоная ступень, вучонае званне | |
| Назва даклада | |
| Адрас (+індэкс) | |
| Кантактны тэлефон (+код), e-mail | |
| Форма ўдзелу (вочная або дыстанцыйная) | |
| Браніраванне гасцініцы (так, не) | |
| Згода на апрацоўку персанальных даных<br><br>***Падаючы заяўку для ўдзелу ў канферэнцыі, Вы пагаджаецеся на апрацоўку персанальных даных, а Аргкамітэт канферэнцыі гарантуе выкарыстанне даных толькі для мэт правядзення канферэнцыі без перадачы інфармацыі трэцім асобам*** | Так |

Файл з заяўкай на ўдзел у канферэнцыі называецца па прозвішчы ўдзельніка: Іваноў_заяўка.rtf.

Дадатак 2

## Патрабаванні да афармлення тэксту даклада

Дакумент захоўваецца ў фармаце *.rtf, файл з тэкстам артыкула называецца па прозвішчы ўдзельніка: Іваноў_артыкул.rtf

Аб'ём – да 20 000 знакаў з прабеламі.

Палі: усе – 2 см; абзац – 1,25 см (не выкарыстоўваць табуляцыю і прабелы!); міжрадковы інтэрвал – адзінарны. Тэкставы рэдактар Microsoft Word, шрыфт Times New Roman (асноўны тэкст – 14 пт, анатацыя, ключавыя словы, бібліяграфічны спіс – 12 пт, зноскі – 10 пт). Ілюстрацыйны матэрыял набіраецца курсівам, магчыма вылучэнне тоўстым шрыфтам. Прымусовы перанос слоў не дапускаецца. Табліцы, подпісы да іх і да малюнкаў набіраюцца шрыфтам 12 пт.

У першым радку злева ўказваецца УДК (курсіў).

Праз радок па цэнтры – прозвішча і ініцыялы аўтара (тоўсты шрыфт), ніжэй у дужках – установа, якую прадстаўляе аўтар, горад, краіна (курсіў).

Назва артыкула даецца праз радок па цэнтры вялікімі літарамі тоўстым шрыфтам.

Праз радок пасля назвы – анатацыя (60–80 слоў, курсіў). На наступным радку прыводзіцца пералік ключавых слоў праз коску (5–9 слоў, курсіў). Словазлучэнне ***«Ключавыя словы»*** даецца курсівам і тоўстым шрыфтам. Анатацыя і ключавыя словы падаюцца на адной з рабочых моў, адрознай ад мовы асноўнага тэксту даклада.

Асноўны тэкст даклада змяшчаецца праз радок пасля ключавых слоў.

Праз радок пасля асноўнага тэксту даклада па цэнтры радка падаюцца словы ***«Спіс выкарыстаных крыніц»*** (курсіў, тоўсты шрыфт). Праз радок – пералік крыніц.

Літаратура афармляецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК Рэспублікі Беларусь (https://vak.gov.by/node/8026). Крыніцы падаюцца ў алфавітным парадку. У тэксце спасылкі на літаратуру прыводзяцца ў квадратных дужках з указаннем нумара крыніцы і нумара старонкі (праз коску), напрыклад: [5, с. 115]. Пры спасылцы адразу на некалькі крыніц іх нумары раздзяляюцца кропкай з коскай: [5, с. 115; 7, с. 45]. На ўсе крыніцы павінны быць зроблены спасылкі ў асноўным тэксце артыкула.

Двукоссе ў тэксце выкарыстоўваецца ў выглядзе «елачак» (« »). Выкарыстанне двукосся ў выглядзе «лапак» (“ ”) дапускаецца толькі ўнутры цытат. Зноскі пастаронкавыя, пазначаюцца знакам «зорачка» (*, **, ***).

У тэксце даклада абавязковым з'яўляецца выкарыстанне функцыі «непарыўны прабел» паміж ініцыяламі і прозвішчам (напр., І. А. Іваноў), паміж скарочаным абазначэннем тыпу населенага пункта і яго назвай (напр.,

г. Мінск), паміж лічбамі і наступным словам або агульнапрынятым скарачэннем пры ўказанні дат, часавых прамежкаў, розных колькасных паказчыкаў (напр., 17 верасня 1939 г., XX–XXI стст., 10 кг). Стагоддзі запісваюцца рымскімі лічбамі.

Калі ў тэксце выкарыстоўваюцца адметныя шрыфты, то яны падаюцца асобным файлам разам з тэкстам артыкула. Малюнкі і фотаздымкі павінны мець кароткія загалоўкі, яны падаюцца асобнымі файламі ў фарматах *.tif, *.jpeg, *.gif.

**Узор афармлення тэксту даклада**

*УДК*

**А. А. Іваноў**

*(Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт, г. Мінск, Беларусь)*

**НАЗВА АРТЫКУЛА**

*Анатацыя* *(60–80 слоў)*
……………………………………………………………………………

***Ключавыя словы:*** *(5–9 слоў, праз коску) ..., ..., ..., ...*

Тэкст…………………………………………………………………
……………………………………………………………………………
……

***Спіс выкарыстаных крыніц***

1.
2.